# **Памяць** жыве

Умацаванню духоўна-маральных каштоўнасцей, заснаваных на традыцыях беларускага народа, у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў надаюць асаблівую ўвагу. Тут лічаць патрыятычнае выхаванне падмуркам будучыні краіны. І гэта ацэнена на самым высокім узроўні. За актыўную дзейнасць у патрыятычным выхаванні моладзі і рэалізацыю праекта **«Лінія памяці. Код вайны»** калектыву БДУКМ была прысуджана прэмія Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне».

Як адзначае рэктар установы Наталля Карчэўская, штуршок да ўзнікнення ідэі — узбуджэнне Генеральнай пракуратурай справы па факце генацыду беларускага народа ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Ажыццяўленне задумы стала магчымым дзякуючы падтрымцы Кіраўніка дзяржавы. У 2023 годзе дацэнт кафедры харэаграфіі ўніверсітэта Вольга Наўроцкая (аўтар і галоўны балетмайстар праекта) была ўдастоена гранта Прэзідэнта ў галіне навукі, адукацыі, аховы здароўя і культуры. Так праект быў увасоблены.
Над пастаноўкай «Лінія памяці. Код вайны» шчыравала каля 75 чалавек — танцоры, музыканты, мастакі па касцюмах, іншыя адмыслоўцы.
У падрыхтоўцы спектакля былі задзейнічаны студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта. Таксама далучыліся дзіцячыя харэаграфічныя калектывы: праект RDC з Мінска і Stay dance project з Рагачова, узорны





ансамбль танца «Натхненне» сталічнага Палаца дзяцей і моладзі. З гэтымі калектывамі ВНУ кантактуе даўно, таму не было сумневу: яны здольныя годна ўвасобіць усе задумкі аўтараў праекта. Значны ўнёсак у агульную справу зрабілі і юныя чытальнікі — пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Жывая класіка».

Удзел дзяцей і моладзі ў праекце — вельмі важны момант. Роўны навучае роўнага. Юнакі і дзяўчаты расказваюць сваім равеснікам пра трагедыю, якая адбылася 80 гадоў назад з іх аднагодкамі. Дарэчы, спектакль ідзе 45 хвілін, як звычайны ўрок у школе. І гэта зроблена не выпадкова, бо праект павінен стаць для маладога пакалення сапраўдным урокам памяці аб мінулым.

Праект уяўляе сабой цэльны канцэрт-спектакль, у якім утрымліваецца глабальны духоўна-патрыятычны мэсэдж пра тое, што кожнаму новаму пакаленню мы павінны, нібы ген памяці, перадаваць усеагульную думку пра недапушчальнасць любой вайны на прыкладзе Вялікай Айчыннай. Структурна спектакль складаецца з тэматычных блокаў.

Аўтары пастаноўкі паспрабавалі расказаць пра трагічныя падзеі мінулага на мове творчасці. Як падкрэсліла Вольга Наўроцкая, ва ўніверсітэце заўсёды звярталіся да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, таму мелі ў актыве некалькі якасных харэаграфічных нумароў. Пасля дапрацоўкі і атрымаўся цэльны спектакль.

Першапачаткова планавалася паказаць «Лінію памяці. Код вайны» ў розных рэгіёнах нашай краіны. І фрагменты пастаноўкі бачылі госці мемарыяльных комплексаў у Трасцянцы і Брэсцкай крэпасці, а таксама ў рамках грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства». Аднак цалкам прадставіць гэты маштабны праект (чатыры

















сцэнічныя лакацыі, у якіх адна з адной перацякае дзеянне, складаная ўстаноўка святла) на розных пляцоўках краіны не выпадала. І ўніверсітэт, як падкрэсліла Наталля Карчэўская, удзячны міністэрствам адукацыі і культуры, якія знайшлі магчымасць прывезці гледачоў у Мінск. Мастацкі ўзровень, маштаб, а таксама шчырая глядацкая зацікаўленасць дазволілі праекту здабыць доўгае жыццё. Юныя танцоры сталеюць, учарашнія студэнты становяцца маладымі спецыялістамі, іх замяняюць новыя таленты. Ідэя работы па-ранейшаму актуальная — і паказы працягваюцца.

Распавядаць пра трагічныя падзеі мінулага на мове творчасці — неабходна. Рэктар БДУКМ упэўнена, што дзякуючы падобнаму асэнсаванню гісторыі распаўсюджваецца думка аб недапушчальнасці вайны.

— Часам бывае складана ўспрыняць страшную інфармацыю з публікацый у СМІ ці з навуковых работ. Тады на дапамогу прыходзяць творы мастацтва, здольныя крануць кожнага, — падкрэслівае Наталля Уладзіміраўна. — Успомнім карціны Міхаіла Савіцкага, што леглі ў аснову сюжэтнай канвы нашага спектакля. У свой час вялікі жывапісец асэнсаваў тэму стойкасці людзей у нечалавечых умовах, прыцягнуў грамадскую ўвагу да жахаў ліхалецця. У такім выпадку мастацтва выконвае выхаваўчую функцыю, нагадвае, што вайна — гэта страшна і што падобнае не павінна паўтарыцца.



